ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.32 (3344) ● ЧАЦВЕР, 22 ЖНІЎНЯ, 2013

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**



...А грамадзянства не мяняў
Стар. 2

Даніна павагі “белавалосаму пасланцу”
По ініцыятыве ЮНЕСКА пачало адзначацца 200-годдзе з дня нараджэння Іосіфа Гашкевіча
Стар. 3



Ціхія фарбы з птушынага царства
На чарговай выставе ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва раскашуюць крылатыя “фотамадэлі”
Стар. 4

РОДНАЕ

Спатканне з цудам

Падарожжы па экалагічным цэнтры “Станькава” набываюць усё большую папулярнасць



ЛЯВОН ЦЕЛЕШ

Комплекс “Старая граніца” – на тэрыторыі экацэнтра

Вёска Станькава — кіламетраў за дзесяць ад Дзяржынска і за сорак ад Мінска. Ведаюць яе найперш дзякуючы маляўнічаму парку, які стварыў яшчэ граф Эмерык фон Гутэн-Чапскі. Іншыя згадаюць, пачуўшы назву вёскі, і юнага партызана, Героя Савецкага Саюза Марата Казея, які там і нарадзіўся, і пахаваны. Са Станькавам звязаны яшчэ жыццёвы шлях святой Валянціны Мінскай. Як бачым, даволі знакамітая вёска! Вядомасці ёй надае і тое, што трэці ўжо год побач з паселішчам прымае шматлікіх гасцей-турыстаў экацэнтр “Станькава”.

Хто стварыў яго? Вядомы і па-за межамі краіны мясцовы агракамбінат “Дзяржынскі”. Нядаўна і я наведаў маляўнічы куточак Дзяржыншчыны, а гідам была супрацоўніца экацэнтра Алена Алесіевіч. Уражанні ад вандроўкі такія, нібы з цудам спаткаўся! Уявіце сабе: больш за 500 гектараў, і тэматычныя зоны — на любы густ. Першай была конеферма. Прыгожыя коні розных парод, ёсць крыты манеж, канкурнае поле — проста рай як для аматараў коннага спорту, так і для дзяцей. Можна пакатацца на брычцы ці дыліжансе, вярхом на шатландскім поні.

А вось заасад. У прыгожа аздобленых хатках кватаруюць дзясяткі розных птушак і жывёл. Алена казала: прадстаўнікоў рэдкіх парод птушак спецыялісты агракамбіната збіралі амаль з усёй Еўразіі. Афрыканскія страўсы, фазаны, паўліны, байцовыя куры, індыкі, мускусныя качкі, прыгажуны-буслы ды мноства іншых птушак абжыліся на сваіх новых сядзібах. Шмат там і звяроў, прычым амаль усе маюць мянушкі, на якія ахвотна рэагуюць. У адным вальеры жыве парачка дзікоў, гэта мясцовыя Рамэа і Джульета, побач самка дзікі Дуся. Люська і Сцёпка — мянушкі ваўкі, а тыбецкі бык рэагуе на мянушку Якаў. Там яшчэ ламы, зубры, карлікавыя в’етнамскія свінні, камерунскія авечкі... Большасць насельнікаў заасада людзей не баіцца, ахвотна пазіруе перад фотакамерамі, чакае пачастункаў. У заасадзе больш за 40 відаў птушак і жывёл, а вандраваць па ім зручна, узяўшы напракат ролікавыя канькі ці ровар.

У “Партызанскім лагеры” 11 зямлянак

У заасадзе жывуць дзясяткі розных жывёл і птушак

Хто прытаміўся — можа адпачыць, падсілкавацца ў дзіцячым кафэ “Мішутка”. На тэрыторыі экацэнтра дзеці ахвотна скачуць на батутах, катаюцца на лодках і электрамабілях. Ля ўваходу на тэрыторыю будуецца драўляная капліца. Амаль з усіх бакоў да экацэнтра “Станькава” падступае лес — там у ваенныя часы быў прытулак для мірных жыхароў і народных мсціўцаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў ваколіцах Станькава дзейнічала шмат партызанскіх брыгад. Вось і пры стварэнні экацэнтра гэта ўлічылі. Цяпер там можна прайціся партызанскімі сцяжынкамі, а комплекс “Партызанскі лагер” —сучасная рэканструкцыя падобнага паселішча ваенных часоў. Дарэчы, лагер створаны з дапамогай супрацоўнікаў Музея Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў.

Вы калі-небудзь бачылі такое: 11 зямлянак, майстэрня па вырабе і рамонце зброі... Кажуць, з асаблівым інтарэсам аглядаюць іх хлапчукі, якім і самім хочацца рабіць падобныя сховы ў лесе. Так цікава разглядваць прадметы партызанскага побыту — нібы ў часе падарожнічаеш. Непадалёку расце вялізны дуб, якому больш за 500 гадоў, названы “лясным вартавым”. Патрымаўшыся за яго шурпатую кару, можна загадаць жаданне, якое спраўдзіцца, кажуць, абавязкова.

Ёсць у Станькаўскім лесе і прыгожая альтанка для адпачынку. А наталіць смагу можна з крынічкі: клапатлівыя рукі мясцовых майстроў зрабілі над ёй церамок, зручныя падходы. Вадзіца смачная! Адпачыўшы, рухаемся далей — па лесе і па часе. Як вядома, непадалёк ад Станькава да 1939 года праходзіла савецка-польская дзяржаўная мяжа. Таму лагічна, што ў экацэнтры стварылі і музейны ваенна-гістарычны комплекс “Старая граніца”. Там можна пабачыць фартыфікацыйныя збудаванні, казармы, мытны пост, пагранзаставу. І нават сапраўдны трохамбразурны кулямётны ДОТ. Дэманструецца і ваенная тэхніка: самаходныя артустаноўкі, мінамёты, супрацьтанкавыя пушкі, танкі, гаўбіцы... Нават тэхнічныя сродкі вайны на моры можна пабачыць — ёсць у гэтым незвычайным музеі фугасныя авіябомбы, тарпеды, карабельныя міны.

Яшчэ на тэрыторыі экацэнтра — цэлы гасцінічны комплекс для сямейнага і калектыўнага адпачынку, рэстаран “Графскі маёнтак” з адметнай нацыянальнай і еўрапейскай кухняй.

У часе падарожжа па экацэнтры “Станькава” я ўпэўніўся: там створаны ўсе ўмовы для цікавага і карыснага адпачынку. Вельмі шмат наведвальнікаў летам — вучні едуць цэлымі класамі. Акрамя нашых суайчыннікаў, у экацэнтры былі госці з Кубы, Бельгіі, Кітая, В’етнама, Арабскіх Эміратаў, Расіі, Украіны, Казахстана, Польшы. У выхадныя і святочныя дні — па 500 і больш турыстаў. Мяркую, уражанні ад сустрэчы з адметным, гістарычна багатым кутком Беларусі ў іх застаюцца самыя прыемныя.

Лявон Целеш,
г. Дзяржынск

ПАМЯЦЬ

Незабыўны подзвіг танкіста

Аднавіць справядлівасць у дачыненні да прадзеда-героя дапамагла мінская гімназістка Кацярына Калабанава

Іна Ганчаровіч

Экіпаж танка КВ-1, якім камандаваў Зіновій Калабанаў

Мітынг памяці Зіновія Калабанава прайшоў на Чыжоўскіх могілках Мінска. А напярэдадні на прэс-канферэнцыі генерал-маёр у адстаўцы, старшыня Беларускага саюза афіцэраў Яўген Мікульчык расказаў, што ў гонар гераічнага бою экіпажа пад кіраўніцтвам камандзіра танкавай роты старшага лейтэнанта Зіновія Калабанава ладзіцца акцыя “Памяць”. Подзвіг яго, лічаць ветэраны і ваенныя гісторыкі, не менш значны, чым подзвігі Аляксандра Матросава, Мікалая Гастэлы, Аляксандра Пакрышкіна ды іншых герояў, чые імёны сталі сімваламі мужнасці. Праўда, імя чалавека, які здзейсніў подзвіг у танкавым баі, што не мае аналагаў у гісторыі войнаў, пакуль не ўсе ведаюць.

Зіновій Рыгоравіч нарадзіўся ў 1910-м у Ніжагародскай губерні, з 1932-га ў Чырвонай арміі, закончыў Арлоўскае бранятанкавае вучылішча. Удзельнічаў у савецка-фінскай вайне, а з пачаткам Вялікай Айчыннай — камандзір роты цяжкіх танкаў у 1-й танкавай дывізіі Ленінградскага фронту. Векапомны бой адбыўся 19 жніўня 1941 года ў раёне Гатчыны Ленінградскай вобласці. Гэта была танкавая бітва, якая мела важнае і неацэннае значэнне ў ходзе баёў на Ленінградскім фронце.

→ Стар. 2

ЛЁСЫ

…А грамадзянства не мяняў

Праз Беларусь, Расію і Украіну праходзілі жыццёвыя шляхі афіцэра ў адстаўцы Мікалая Бойкі. Але ён заўсёды памятае, адкуль яны пачыналіся: з палескай вёскі Лелікава, што на Кобрыншчыне.

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Мікалай Бойка

Іван і Валянціна Ждановічы

Чытачы газеты ведаюць: Мікалай Бойка — наш пастаянны аўтар з Кіева. Пісаў і пра беларусаў Самары, з якімі ў сяброўстве. А на пачатку жніўня з'явіўся яго цікавы артыкул "Землякі камандуюць флатамі" — пра Юрыя Ільіна, камандуючага ВМС Украіны, і Аляксандра Вітко, камандуючага ЧФ Расіі. Абодва віцэ-адміралы, аказваецца, ураджэнцы Беларусі, з Рагачова і Віцебска адпаведна. Што ж, цесныя братэрскія сувязі традыцыйна існуюць паміж трыма славянскімі народамі спрадвеку. Ды і лёс самога Мікалая Бойкі, капітана 3 рангу ў запасе — так ён падпісаў артыкул — таму пацвярджэнне. Мы ўжо згадвалі пра дапамогу Мікалая пад час нашай камандзіроўкі ва Украіну: ён "камандаваў парадам" у кантактах з суайчыннікамі. Пра тое, як шляхі вялі іх да Кіева, расказалі былы палкоўнік міліцыі Аляксандр Зарубіцкі, юрыст дзяржаўнай авіяслужбы Міністэрства інфраструктуры Украіны Юля Аўдзеенка. А як апынуўся там Мікалай Бойка?

Калі па праўдзе, то Украіна ніколі не была для яго чужою: нарадзіўся на беларуска-ўкраінскім памежжы ў "савецкім" 1961-м, калі ўвогуле, кажа, не звярталі ўвагі на мяжу. Пасля восьмага класа Мікалай спрабаваў паступіць у суворaўскае вучылішча, пасля дзесяці — у ваенна-палітычнае вучылішча МУС: няўдалая. "Можа і добра, што так здарылася, — усміхаецца Мікалай Іванавіч, — Урэшце скончыў сярэднюю школу ў роднай вёсцы, стаў трактарыстам, папрацаваў на палях калгаса "Чырвоная зорка", якога на сённяшні дзень, на жаль, не існуе". У маі 79-га па камсамольскай пуцёўцы пайшоў на флот.

З землякамі-спартсменамі з Брэста ў Кіеве, на турніры гарадоў-герояў

Амаль паўтара года служыў паляшук спачатку на Балтыцы, набываючы спецыяльнасць тэлеграфіста ў Школе сувязі імя А. Папова, потым на Паўночным флоце, у знакамітым Северадзвінску: быў сярод тых, хто забяспечваў сувязь, у тым ліку і з падлодкамі. Думаў пасля службы падацца ў міліцыю, а сябар падгаварыў паступаць у Кіеўскае вышэйшае ваенна-марское палітычнае вучылішча. У 84-м, афіцэрам, размеркаваўся на Ціхаакіянскі флот, на вялікі дэсантны карабель "Іван Рогаў". Служыў сакратаром камітэта камсамола. "Карабель быў адзін з самых сучасных на той час, — згадвае Мікалай. — Пры адсутнасці плаўсродкаў мог браць на борт альбо да 50 танкаў, альбо да 80 БТР і БМП, альбо да 120 аўтамабіляў. Умяшчаў 4 верталёты, 4 катэры, батальён марской пяхоты. Гэта вельмі добрая школа жыцця для мяне была. Тры гады адслужыў на караблі, потым — памочнікам начальніка палітадзела дывізіі марскіх дэсантных сіл па камсамольскай рабоце.

З пасады намесніка камандзіра ВДК па палітчастцы ў 90-м паступіў у Ваенна-палітычную акадэмію імя Леніна ў Маскву. Дарэчы, рэдка каму з першага разу тое ўдавалася. Але Саюз разваліўся, пачалося скарачэнне у флоце, арміі... І ён вырашыў: у такой сітуацыі трэба трымацца, як кажуць маракі, бліжэй да роднага берага. Пасля заканчэння акадэміі Мікалай, як і іншыя беларусы, што выказалі жаданне служыць Бацькаўшчыне, быў накіраваны ў Беларусь і прызначаны намеснікам камандзіра палка матэрыяльнага забеспячэння па выхаваўчай працы ў Барысаве. З гэтай пасады і пайшоў у запас…

Маючы са школы цягу да журналістыкі, у Барысаве Мікалай пачаў супрацоўнічаць з газетай "Знамя юности". "І з Кіева пісаў туды пад рубрыкай "Сустрэчы на Храшчаціку": пра сустрэчы з украінскімі беларусамі, — згадвае зямляк. — А чаму ў Кіеве апынуўся? Жонка — кіяўлянка. Але я грамадзянства не мяняў: па гэты час жыву з беларускім пашпартам".

З Бацькаўшчынай у Мікалая моцныя стасункі: "Усё з ёю звязвае: і сябры, і сваякі, і ўспаміны… Вёска Лелікава, помніцца мне, вялікая была, каля 2800 жыхароў, цяпер значна меншая. Лічу, калі пракласці асфальт да яе, падвесці газавую трубу, а там за шэсць кіламетраў магістральны газаправод, то яна ажыве. Думаю, з часам так і будзе". Назаўсёды запала ў душу Мікалая размова з прафесарам Кіеўскага ўніверсітэта Паўлам Матышэўскім: ён грамадзянін Украіны, беларус па каранях, з вёскі Клешава цяпер Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Павел Сямёнавіч неяк прызнаўся земляку: рэчка родная сніцца… "Малая радзіма жыве ў сэрцы заўсёды і нікуды не сыходзіць! — узрушана гаворыць Мікалай. — І я з такім адчуваннем жыву, таму і працую ў беларускай тэматыцы. Па Украіне, Расіі жывуць тысячы беларусаў, многія — людзі унікальныя: медыкі, упраўленцы, журналісты, афіцэры... Чаго варты наш зямляк-спявак, народны артыст Украіны Мікола Коваль! Кагорта вялізная. І ў кожнага настальгія ў душы. Неяк прыйшоў да земляка, а ён мне, незнаёмцу, дзверы адчыніў. "Вы не баіцеся?" — пытаю. "Дык вы ж братка-беларус!" — усміхаецца дзядуля. У яго сэрца наросхрыст. І я па вачах бачу: наш чалавек".

Што ж, і Мікалай Бойка — наш у Кіеве. Яго артыкулы і цяпер ёсць у рэдакцыі. Зарабляе на жыццё журналістыкай, але, прызнаўся, "магу і як грузчык папрацаваць: ніякай працы не цураюся". А ў планах калегі — больш пісаць пра беларусаў замежжа, з часам сабраць нататкі пад адной вокладкай у кнігу.

ПАМЯЦЬ

Незабыўны подзвіг танкіста

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Тады пяць савецкіх танкаў КВ-1 знішчылі 43 танкі, 11 бронетранспарцёраў і 19 гармат праціўніка! З іх 22 танкі — на рахунку экіпажа камроты старэйшага лейтэнанта Калабанава. Той бой нават апісваўся ў падручніках узброеных сіл нацысцкай Германіі: гэта свайго роду вучоба на памылках. За той подзвіг старлей не атрымаў звання Героя Савецкага Саюза — толькі ордэн Баявога Чырвонага Сцяга. Тая ўзнагарода, кажуць ветэраны, на дзве прыступкі ніжэй. Дзень Перамогі герой сустрэў у Берліне. Завяршыў службу ў Беларускай ваеннай акрузе ў званні падпалкоўніка.

Доўгі час подзвіг Калабанава заставаўся непрызнаным: ніхто не верыў, што столькі падбіта танкаў. Справядлівасць адноўлена дзякуючы настойлівасці сына і баявых таварышаў танкіста з Беларускага саюза афіцэраў. Дэталёвым вывучэннем подзвігу прадзеда занялася яго праўнучка Кацярына Калабанава, вучаніца 61-й мінскай гімназіі. Вывучыўшы дакументы, яна высветліла: узнагароду Зіновію Калабанаву "знізілі" толькі таму, што першым далажыў аб разгроме варожых танкаў пад Гатчынай Маршалу Савецкага Саюза Кліменту Варашылаву камандзір батальёна — яму і далі Героя…

АНДРЭЙ АРЦЮХОЎСКІ

Урачыстасць на Чыжоўскіх могілках

Дзякуючы актыўнасці, настойлівасці дзясяткаў людзей удалося ўнесці ўдакладненні ў ваенную гісторыю. На прэс-канферэнцыі прадпрымальнік Васіль Моніч, які ў 2006-м за кошт уласных сродкаў усталяваў помнік бясстрашнаму танкісту, казаў: "Мы ў неаплатным даўгу перад усімі, хто нас абараняў. І крылатыя словы "Ніхто не забыты, нішто не забыта!" павінны стаць для нас маральным законам. Тысячы герояў ужо сышлі ад нас незваротна. Наш абавязак перад імі — ведаць і памятаць кожнае імя. Бярыце прыклад з праўнучкі Зіновія Калабанава! Шукайце і пішыце пра землякоў, знаёмых, сваякоў удзельнікаў вайны. Не забывайце пра гераічнае мінулае нашага народа!"

Акцыя "Памяць", прысвечаная экіпажу З. Калабанава, прайшла па ініцыятыве Беларускага саюза афіцэраў. У мітынгу на Чыжоўскіх могілках удзельнічалі ветэраны вайны, прадстаўнікі моладзевых арганізацый. Граў духавы аркестр, ускладаліся кветкі, салютавала героям рота ганаровай варты.

АДЗІН З НАС

Дзякуй, Доктар!

Віншаванні з 75-гадовым юбілеем знакаміты беларускі нейрахірург Арнольд Смеяновіч прымаў з розных краін свету

У айчыннай нейрахірургіі Арнольда Фёдаравіча цалкам апраўдана называюць патрыярхам: ён ратуе жыцці ўжо больш за паўстагоддзя. Для ўраджэнца Бранска, які ў 1960-м закончыў Мінскі медінстытут, працаваў у глыбінцы на Магілёўшчыне, беларуская зямля стала роднаю, тут ён адбыўся як асоба. Правёў ужо больш за 10 тысяч аперацый, вялікая частка якіх — на галаўным мозгу. Дарэчы, і ў свае 75 ён штодня ўстае за аперацыйны стол. Некалькі гадоў узначальваў Інстытут неўралогіі, цяпер — загадчык нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі.

З юбілеем хірурга павіншаваў Прэзідэнт Беларусі. "Перакананы, што Вашы таленты, навуковы аўтарытэт і багаты практычны вопыт будуць і ў далейшым садзейнічаць развіццю беларускай медыцыны" — гаворыцца ў віншаванні.

У выбары спецыяльнасці, расказаў неяк доктар, вялікую ролю адыграла яго бабуля, якая настаўляла: "Унучак, табе трэба ў медыцыну!". А яшчэ пад час вайны, хлопчыкам, ён быў паранены, і яго аперыраваў нямецкі доктар. Малы тады яшчэ быў, мала памятае, але яго мама расказвала, што ўрач быў вельмі добрым. Такім жа добрым,

Доктар Арнольд Смеяновіч

уважлівым, высокапрафесійным лекарам стаў і Арнольд Фёдаравіч. Самаадданая праца на карысць людзей дала добры плён. Цяпер спадар Смеяновіч — прафесар, акадэмік НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржпрэміі Беларусі. Ён старшыня Беларускага таварыства нейрахірургаў, ганаровы член Асацыяцыі нейрахірургаў Расіі, аўтар 25 вынаходстваў і патэнтаў, больш за 400 навуковых прац. Аднак галоўнае дасягненне — гэта, пэўна, тысячы жыццяў пацыентаў, якія дзякуючы хірургу былі ўратаваныя. Яны жывуць па ўсім свеце, і віншаванні юбіляр прымаў з розных краін.

Неяк у размове з журналістамі ён разважаў: "Чаму існуе бясконцасць, чаму мы жывем, чаму зіму змяняе вясна, а лета — восень? Памойму, усё гэта нездарма. Космас, знешнія сілы, безумоўна, уплываюць на жыццё людзей і на ўсё, што нас акружае. Аднак шмат што залежыць і ад самога чалавека. Калі ён паступае па сумленні, добры і гатовы дапамагаць іншым, тады яму і нябёсы дапамагаюць".

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Даніна павагі “белавалосаму пасланцу”

Па ініцыятыве ЮНЕСКА пачало адзначацца 200-годдзе з дня нараджэння Іосіфа Гашкевіча

Мемарыяльны камень у Малях

Адам Мальдзіс

Папку для выразак з друку, дакументаў і перапіскі, звязаных з асобай Іосіфа Гашкевіча, першага консула Расійскай імперыі ў Японіі, я завёў у 1970-х. Гэта калі ўстанавіў, што апошнія гады жыцця ён правёў у маёнтку Малі (націск на першым складзе), на тэрыторыі цяперашняга Астравецкага раёна, маёй “малой радзімы”. У школьныя гады, часам ездзячы па дарозе Астравец—Варняны, я не раз прыглядаўся да густых прысад, якія на пад’ездзе да Маляў вялі кудысьці налева. Потым, прачытаўшы кніжку маскоўскага аўтара Віталя Гузанава “Адысей з Белай Русі”, даведаўся: маёнтак выкупіў пасля паўстання 1863 года адстаўны ўжо “белавалосы пасланец”, як называлі дыпламата ў Японіі — тым ён выразна адрозніваўся ад тамтэйшых жыхароў. А мясцовы педагог (здаецца, Лугоўскі) паказаў мне месца, дзе, паводле ўспамінаў старажылаў, Гашкевіч быў пахаваны — каля пачатку ўсходняй сцяны касцёла ў імя святых Казьмы і Дзям’яна (прыкладна ў 1866—1919 гадах то была праваслаўная царква). Як стацкі саветнік і вядомы вучоны ён меў права спачыць каля самой святыні. Праўда, супакой аказаўся не вячыстым: з прыходам польскай улады і аднаўленнем касцёла мясцовыя фанаты ноччу зраўнялі праваслаўныя магілы з зямлёй, надмагілле Гашкевіча знікла, а потым сышла і памяць пра яго.

Як жа аднавіць тую памяць? Аблазіў я ў пошуках могілкі на выездзе з колішняга мястэчка, потым гарпасёлка, а цяпер горада Астраўца ў напрамку да станцыі Гудагай. І толькі з часам зразумеў, што яны закладзены значна пазней, чым адбылося пахаванне дыпламата. Потым шукаў некралог у віленскай прэсе, друкаваў артыкулы... Неяк мне пазванілі з аддзела культуры ЦК кампартыі Беларусі, паведамілі: з Японіі ў Беларусь прыязджае (праз Сібір і Урал!) цэлы аўтобус сяброў Таварыства імя Гашкевіча на чале з яго старшынёй прадпрымальнікам Такада Касічы. Яны, маўляў, жадаюць пабываць там, дзе лунае дух нябожчыка. Я расказаў усё, што ведаў. З Мінска паляцеў запыт у Астравец. Адтуль паведамілі: войны, разбурэнні... На месцы, дзе жыў у апошнія гады консул, — жывёлагадоўчая ферма, японцам запрапанавалі ехаць у Вільнюс: маўляў, там, на праваслаўных могілках Ліпаўка, пахаваны ці не той самы Гашкевіч.

Бюст Іосіфа Гашкевіча ў Астраўцы

І далёкія госці сапраўды знайшлі там магілу Гашкевіча. Але — Іосіфа Іосіфавіча, сына дыпламата, чалавека таксама заслужанага, аўтара кніжкі пра населеныя пункты Віленскай губерні. Той якраз жыў у Вільні і там быў пахаваны. А цела былога консула ці маглі ж везці за 50 вёрст з Маляў у Вільню? Ды і навошта, калі другая жонка (першая памерла ў Японіі: мне ўдалося адшукаць каля царквы ў Такадатэ яе магілу) Кацярына Сямёнаўна і маленькі іх сын яшчэ жылі ў трох вярстах ад Астраўца з яго прыходскімі могілкамі. Дзе, дарэчы, яны былі? Пэўна ж, ля самой святыні, на ўсход ці на поўнач ад яе… Для канчатковага вываду трэба шукаць старыя планы мястэчка.

Што да Такада Касічы, то мы сустрэліся яшчэ ў Токіа ў кастрычніку 2001-га: тады я, дзякуючы Гашкевічу, стаў тыднёвым госцем Міністэрства замежных спраў Японіі. Такада-сан спачатку быў стрыманы, думаючы, што гэта я выступіў дэзінфарматарам у гісторыі з магілай дыпламата. Потым ахвотна пагадзіўся сустрэць мяне ў горадзе Такадатэ на востраве Такайда (гэта блізкая да Расіі поўнач Японіі), дзе была дыпмісія Гашкевіча. Там мы разам наведалі прыватны музей Такада Касічы, дзе я абвязаў сатканым на Астравеччыне дэкаратыўным рушнікам бюст (не помнік, як пісалі ў мінскім друку!) Гашкевіча работы маскоўскага скульптара, народнага мастака СССР Алега Комава. Пабывалі мы і ў іншых мясцінах горада, звязаных з “белавалосым пасланцом”. Тое падрабязна апісана ў маім “Японскім дзённіку”, змешчаным у 2002 годзе ў штомесячніку “Кантакты і дыялогі”.

Такада Касічы ў кастрычніку 2002-га зноў наведваў Беларусь, прыняў у Мінску і Астраўцы ўдзел у другіх Міжнародных чытаннях у гонар Іосіфа Гашкевіча, прысутнічаў у Малях на адкрыцці трох каменяў-помнікаў дыпламату, устаноўленых лідскім скульптарам Рычардам Грушай. Матэрыялы чытанняў выйшлі ў зборніку “Беларусь—Японія” (з серыі “Беларусіка =Albaruthenica”).

Нядаўна з круглага стала “Беларусь і Японія: Міжнародны культурны дыялог” у Інстытуце культуры Беларусі пачалася падрыхтоўка да юбілею Іосіфа Гашкевіча. Тады Масако Тацумі, кіраўніца грамадскага Цэнтра японскай культуры ў Мінску, паведаміла: Такада Касічы, нашчадка таго самурая Кахея (яму ў Такадатэ пастаўлены помнік), які спрыяў японска-расійскаму зблiжэнню, раптоўна не стала. А яго дачка Нано рашыла ліквідаваць музей бацькі. І цяпер паміж Мінскам і Такадатэ ідуць пісьмовыя перамовы, каб яго экспанаты, найперш бюст работы Комава, не зніклі, а былі прывезены спадчыннікам у час юбілею ў Мінск ці перададзены ў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі: там ужо рыхтуецца юбілейная экспазіцыя.

Гэты матыль названы ў гонар нашага земляка

Што яшчэ зроблена да 200-х угодкаў Іосіфа Гашкевіча, якое будзе ўрачыста адзначацца 14 сакавіка 2014 года? Дарэчы, раней у энцыклапедыях фігураваў год 1815-ы. У красавіку з Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы атрымана копія метрычнага запісу Астравецкай царквы Шумскага дэканата аб смерці нашага суайчынніка, якая наступіла 15 мая 1875 года. Дакументам пацвярджаецца выказаная мной раней думка, што пахаваны І. Гашкевіч на “прыходскіх могілках”. Месца ж іх знаходжання яшчэ трэба знайсці. Пахаванне правялі мясцовыя святары Іаан Васілеўскі і Іаан Макарэўскі, выконваючы абавязкі псаломшчыка Іван Рабінскі, а таксама ключар Іаан Барчыкоўскі, які прыбыў, улічваючы заслугі нябожчыка, з Віленскага кафедральнага сабора. У перададзеным з Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА ў рэдакцыю “Голасу Радзімы” “Папярэднім пераліку” юбілейных мерапрыемстваў значацца правядзенне на базе факультэта міжнародных адносін БДУ навукова-практычнай канферэнцыі (“III Гашкевічаўскіх чытанняў”) і выданне яе матэрыялаў, адкрыццё памятнай дошкі (знака) у месцы пахавання І. Гашкевіча, правядзенне мерапрыемстваў, звязаных з яго імем у Астраўцы і Светлагорскім раёне на Гомельшчыне, дзе ён нарадзіўся (блізкім родзічам яго быў святы Іаан Кармянскі — гэта адзіны цудатворац сярод беларускіх святых), а таксама выпуск памятных манеты, маркі і канверта.

Старонка календара з выявай І. Гашкевіча

Перад юбілеем добра было б, на мой погляд, правесці дадатковыя пошукі ў архівах і музеях Пецярбурга, дзе павінны быць і матэрыялы аб плённай дзесяцігадовай рабоце І. Гашкевіча ў 12-й Рускай духоўнай місіі ў Пекіне (маюцца на ўвазе цыклы артыкулаў у яе “Працах”), і асабісты архіў дыпламата, перададзены яго сынам у расійскую сталіцу. Куды канкрэтна? У Санкт-Пецярбургскі інстытут усходазнаўства — тое адбылося пасля продажы маёнтка ў Малях, а ў Галоўную фізічную абсерваторыю былі накіраваныя астранамічныя і метэаралагічныя даследаванні нашага слыннага земляка. Шкада, што ў Пецярбургу ўжо няма таварыства “Беларусь—Японія”, якое заснавалі калісьці былыя маракі. Але я спадзяюся, што сябры былога таварыства змогуць працягнуць пошукі, калі перакажу ім месцазнаходжанні адпаведных крыніц.

Ну і, вядома ж, будуць ускладзены кветкі да бюста І. Гашкевіча (скульптар В. Янушкевіч, архітэктар Р. Груша), урачыста адкрытага ў цэнтры Астраўца ў 1994 годзе. Папоўняцца экспанатамі музеі вучонага і падарожніка ў 1-й астравецкай гімназіі і Мальскім сельскім доме культуры. А таксама, верыцца, на хвалі юбілею будзе вернута імя Іосіфа Гашкевіча мясцоваму кааператыву, якое згубілі пры ўзбуйненні гаспадаркі. І яшчэ: можа, нарэшце будзе мемарыялізавана тая Якімава Слабада ў цяперашнім Светлагорскім раёне Гомельшчыны, якая падаравала Беларусі, Японіі і Кітаю, усяму чалавецтву выдатнага філолага, які валодаў 13 мовамі, аўтара першага “Японска-рускага слоўніка”, адзначанага медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй, а таксама фундаментальнага даследавання “Карані японскай мовы”.

З хадайніцтвам у ЮНЭСКА наконт юбілею Іосіфа Гашкевіча звярнуліся адразу тры краіны: Беларусь, Расія і Японія. Таму ёсць усе шанцы, што юбілей пройдзе на самым высокім міжнародным узроўні. Нам можна ганарыцца светлай постаццю Працаўніка і Творцы, па сутнасці, першага беларускага дыпламата. Яго шматгранная дзейнасць, яго спадчына пераканальна сведчаць аб даўняй прысутнасці Беларусі, яе слаўных сыноў і дачок на міжнароднай арэне.

РАКУРС

Ціхія фарбы з птушынага царства

На чарговай выставе ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва раскашуюць крылатыя “фотамадэлі”

Іван Ждановіч

Мінчанка Таццяна Раманава спыняе непаўторныя імгненні з жыцця птушак

Хто такая Таццяна Раманава? Раманістка, фотапаляўнічая, рамантык, арнітолаг-аматар… Зрэшты, вось яе невялічкі пралог да фотавыставы “Ціхія фарбы”. Гэткі вобразны “баланс белага”, настройка на кантакт з гледачамі — каб лепш разумелі, як яе мастацтва нараджаецца: “Мая раніца часта пачынаецца, калі ў небе яшчэ свеціць месяц, але на небасхіле пачынаюць праяўляцца фарбы новага дня. Спехам выпітая кава, хуткі погляд у вакно. Фотарукзак на спіну і наперад. Еду на ровары, паглядаючы ў неба: трэба паспець да світання. Хочацца сустрэць маю раніцу разам з птушкамі. Вось я і на месцы: вада, нібы коўдрай, ахінутая туманам. Густым, сырадойным. За ягоным вэлюмам эфемернымі кропкамі дрэйфуюць сонныя птушкі. Неба, вада, туман, птушкі — усё быццам пастэллю напісана... Збіраю скрадок, невялічкі шалашык, апускаюся паціху ў ваду. А там туман такі шчыльны, што не бачу ніводнай птушкі. Зрэдку толькі дзесьці вымалёўваюцца выгнутыя шыі лебедзяў. Гэта не птушкі: намёк на іх прысутнасць, праявы жыцця. Самы пачатак дня... Ціхія фарбы”.

Можна сказаць: творчасць Таццяны ёсць патрабаванне часу. Ва ўсялякім разе, знаўцы мастацтва сцвярджаюць, што паколькі фототэхніка цяпер дасканалая, то ў многіх ёсць эстэтычная патрэба сузіраць прыроду ва ўсёй паўнаце і канкрэтнасці формаў. І сапраўды, тонкія нюансы, дэталі пейзажаў, гульня святла ў каляровым птушыным апярэнні, і калі яшчэ ўсё так блізка, што “пакратаць можна” — гэта заварожвае. Трэба ўлічваць, што птушкі — надзвычай капрызныя “фотамадэлі”. Адзін неасцярожны рух, і кадры пусты. А што дазваляе Таццяне Раманавай рабіць удалыя здымкі дзікіх птушак, як кажуць мастакі, на пленэры? Яна з любоўю і павагай ставіцца да іх, і не проста запасаецца цярпеннем, але і грунтоўна вывучае звычкі пярнатых, сябруе з арнітолагамі Беларусі, Расіі, Францыі.

Мінчанка Таццяна Раманава — філолаг-раманіст па адукацыі, закончыла і магістратуру Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, а ў 2008-м атрымала кваліфікацыю менеджэра-міжнароднікa ва Універсітэце Мішэля дэ Мантэня (Бардо, Францыя). То можа адтуль, цікаўлюся, прывезла захапленне фотапаляваннямі? “Не, гэтая “хвароба” ў мяне яшчэ з Мінска, я пачала прафесійна здымаць птушак, калі працавала выкладчыцай на французкім факультэце МДЛУ, — адказвае яна. — Любоў да французкай мовы, дарэчы, у мяне даўняя: у дзяцінстве жыла ў Францыі. Цяпер там у модзе бёрдвочынг, назіранне за птушкамі. У тым я пераканалася сама, калі два з паловай месяцы праводзіла даследванні, вывучала літаратуру ў Бардо — вучылася на стыпендыю французкага ўрада”.

Цяпер Таццяна працуе на адну вядомую французкую аграфірму: наладжвае кантакты з кліентурай. А ў вольны час — ровар, рукзак, фотаапарат. Муж-беларус у яе фельчар, таксама прыроду любіць, ды у шматгадзінных засідках (па паўдня!) на вадзе бываць, прызналася Таццяна, яму цярпення не хапае. Увогуле ж фотапаляванне яе доўжыцца звычайна ўлетку з паловы чацвёртай да дзевяці раніцы або з шасці вечара да поўнага змяркання. З любімых месцаў пад Мінскам у яе Цнянскае вадасховішча і Дразды — ёй цікавыя вадаплаўныя птушкі. Ёсць удалыя здымкі і з паўднёвага захаду Францыі: там іншы вугал пад’ёма сонца, кажа фотамастачка, больш фарбаў і святла, у адрозненне ад пастэльнасці беларускай раніцы. Самае складанае для яе ў фотавандроўках — немалая вага амуніцыі, “затое калі ўжо на месцы, то проста растаеш у птушках і прыродзе: ні часу, ні стомы не заўважаеш”.

Малая белая чапля

Удалыя здымкі для яе — радасць вялікая. На камп’ютары нічога ў кадр не дадае, хіба што падпраўляе баланс белага. Увогуле яна строгі крытык: выставіла ў зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва 15 сваіх фотакарцін, яшчэ з трыццаць “у кампе”. Кажа, што калі каму з землякоў у замежжы творчасць яе будзе цікавая — можна дамовіцца аб супрацоўніцтве, арганізацыі выставы.

А і сапраўды: паглядзець на Беларусь цераз шматколерную прызму нашых птушак — цікавы ракурс!

СВЯТЫНІ

Ад Херсанэса да Мінска

Архітэктурныя помнікі, іконы, старажытныя рэчы, рукапісы, старадрукаваныя кнігі, архіўныя матэрыялы… У кожнага народа ёсць свае каштоўнасці, духоўныя і матэрыяльныя. Сярод святынь Мінска вылучаецца Мінская ікона Божай Маці. Кажуць, яна цудоўным чынам прыплыла ў горад па рацэ Свіслачы. Існуе царкоўнае паданне, што абраз напісаны самім евангелістам Лукой. Па меркаванні ж даследчыкаў, ікона пісалася ў Візантыі. А святы евангеліст Лука сапраўды з’яўляецца пачынальнікам іканапіснай справы.

Праваслаўная царква святкуе цудоўнае з’яўленне іконы 26 жніўня. Цудатворны абраз — каштоўны помнік, які мае ўласную цікавую гісторыю. Ікону калісьці падарыў грэчаскі патрыярх роўнаапостальнаму князю Уладзіміру, калі ён прыняў хрышчэнне ў Корсуні (Херсанэсе, цяпер гэта тэрыторыя Севастопаля). Князь Уладзімір перадаў святыню ў Дзесяцінную царкву ў Кіеў. Пад час вайны 1482 года Кіеў быў разграблены татарамі, а цудатворны абраз, ёсць паданне, адзін з захопнікаў кінуў у Дняпро. І адтуль цудоўным чынам ікона ў 1500 годзе прыплыла ў Мінск. Святыня была размешчана ў Замкавай царкве.

У 1616 годзе заходне-рускі уніяцкі мітрапаліт Іосіф Руцкі выдаў указ, і ікону перанеслі ў царкву ўніяцкага Свята-Духава манастыра. Пазней яна была вернута праваслаўным у кафедральны Петра-Паўлаўскі сабор. У 1852-м для іконы зрабілі сярэбраную рызу. У 1936 годзе ноччу ікону перанеслі ў краязнаўчы музей. Калі горад быў акупаваны гітлераўцамі, яна “трапіла да іх у палон”, але ўжо ў 1941-м мінчанка Варвара Слабко выпрасіла абраз у нямецкай улады. Ікона была адрэстаўравана і аднесена ў Петра-Паўлаўскі сабор на Нямізе, а ў 1945-м, пасля яго закрыцця, перададзена ў Свята-Духаў сабор.

Абраз Мінскай Божай Маці — адна з галоўных святынь Беларусі. Кожны жыхар ці госць сталіцы можа пакланіцца цудатворнай іконе ў Мінскім кафедральным Свята-Духавым саборы.

Таццяна Карнілава,
бібліятэкар

Проста фантастыка!

Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўвайшла ў рэйтынг фантастычных архітэктурных работ

Амерыканскае выданне “Flavorwire” ўключыла Нацыянальную бібліятэку Беларусі ў рэйтынг фантастычных архітэктурных работ, паведамляецца на сайце выдання. Спецыялісты знайшлі ў свеце шэраг твораў, якія вельмі натуральна выглядалі б у фантастычных фільмах. У рэйтынгу — 20 архітэктурных работ, НББ займае там 11-е месца. Апісваючы будынак бібліятэкі, эксперт выдання адзначае, што тут ёсць уласная аглядная пляцоўка, а ў чытальных залах могуць размясціцца 2000 чалавек.

У рэйтынг таксама ўвайшлі брытанскі павільён для Сусветнай выстаўкі 2010 года ў Шанхаі, курсанцкая капліца акадэміі ВПС ЗША з 17-ю вострымі шпілямі, брусельскі Атоміум, мастацкі музей Мілуокі, іспанскі будынак Аўдыторыа-дэ-Тэнерыфе, футурыстычны музей дызайну ў ізраільскім Халоне, французскі тэматычны парк Футураскоп, пекінскі комплекс Galaxy Soho, канструкцыя галоўнага бахайскага храма Індыі, кафедральны сабор горада Бразіліа, міжнародны аэрапорт Лос-Анджэлеса, дамы-НЛА Саньчжы на Тайвані, мастацкі музей у аўстрыйскім горадзе Грац, а таксама атэль New Beijing Poly Plaza.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
E—mail: golas_radzimy@tut.by

Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1935, Заказ: 695
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2013